СОВЕЦКІ
ПАТРЫЁТ
ОРГАН ЛЯХАВІЦКАГА РК КП(б)Б І РАЙСОВЕТА
ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ
№ 11 (94) | Нядзеля, 11 лютага 1945 г. | Цана 15 кап.

...каб лепш падрыхтавацца да веснавой сяўбы і правесці яе на высокім аграгэхнічным узроўні у найкарацейшы тэрмін.

# Зімой рыхтавацца да веснавой сяўбы

Зімою патрэбна рыхтавацца да веснавой сяўбы. Лёс будучага ўраджая рашаецца цяпер, калі ствараюцца прадпасылкі паспяховага правядзення сева.

Моцна пацярпела наша сельская гаспадарка за час трохгадовага „гаспадарвання" нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У выніку ўсіх тых апусташэнняў і разбурэнняў, якія праводзілі гітлераўцы на акупіраванай імі совецкай тэрыторыі, пасяўная плошча амаль на палавіну скарацілася.

Зараз перад нашай сельскай гаспадаркай стаіць сур'ёзнейшая задача; аднавіць на працягу бліжэйшых двух год, зрабіць яе такой, якой яна была да даваеннага ўзроўня. Гэта цяжкая, але пачотная і ганаровая задача.

Увесь наш совецкі народ гарыць жаданнем хутчэй дабіць полчышчы нямецка-фашысцкай арміі і ўстанавіць доўгі і справядлівы мір. Для гэтага патрэбна, каб уся работа нашага тыла была направулена на дапамогу Чырвонай Арміі, на аднаўленне ўсяго разбуранага гітлераўскімі мярзотнікамі. Трэба хутка аднаўляць і сельскую гаспадарку.

Цяпер, зімою, і патрэбна сялянам і падсобным гаспадаркам рыхтавацца да вясны, з тым разлікам, каб вясною хутка і поўнасцю засеяць свой зямельны ўчастак, каб можна было зняць з яго багаты ўраджай.

Як-жа ідзе па самай справе падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў нашым раёне, як рыхтуюцца соўгасы раёна і падсобныя гаспадаркі да вясення-пасяўной кампаніі?

Праведзенай праверкай устаноўлена, што соўгас „Начы", дзяржаўная канюшня Грушаўка да веснавой сяўбы рыхтуюцца планава. Цяпер ужо ў іх заканчваецца рамонт сельска-гаспадарчага інвентара, насенне ачышчана і засыпана, захоўванне добрае, пасланы абразцы насення ў кантрольную лабараторыю на аналізы.

Аднак, на раду з гэтым, маюцца ў нас гаспадаркі, якія дрэнна рыхтуюцца да веснавой сяўбы. Да такіх адносіцца падсобная гаспадарка Цеофілін—Карнеўшчына (дырэктар тав. Парэцкі). Насенне тут не ачышчана, рамонт сельска гаспадарчага інвентара не праводзіцца. У такім-жа становішчы знаходзіцца і падсобная гаспадарка Сяркоўшчына (дырэктар таварыш Несцяраў), Ганчары (дырэктар тав. Мартаянаў) і інш.

Не сур'ёзна адносяцца да пытання дапамогі у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы падсобных гаспадарак і аднаасобных сялян нашы мясцовыя органы. Яшчэ і да гэтага часу не арганізованы зерняачышчальны пункт пры Ляхавіцкай МТС.

Падсобныя гаспадаркі раёна не прыдалі значэння важнейшаму—абмалоту і выцірашню насеннай чырвонай канюшыны.

Шэраг падсобных гаспадарак ігнарыруюць рашэнні раённых арганізацый, да гэтага часу не прыслаўшы ў Райза сваіх планаў веснавой сяўбы.

Такое становішча з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы нецярпімае. Зараз-жа неабходна разгарнуць падрыхтоўчыя работы да пасяўной кампаніі. Наладзіць сельскагаспадарчы інвентар, ачысціць насенне і г. д.

Толькі ранняя падрыхтоўка да веснавой сяўбы дасць магчымасць хутка і добра правесці яе, а гэта і будзе гарантыяй на добры ўраджай.

# Ад Совецкага Інформбюро

## (З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 8 ЛЮТАГА).

На працягу 8-га лютага, ў Усходняй Прусіі паўднёвей Кенігсберга, нашы войскі ў выніку ўпорных баёў авалодалі гор. КРАЙЦБУРГ, а таксама занялі некалькі населеных пунктаў.

Паўднёвы ўсходней горада Штатгард нашы войскі авалодалі на тэрыторыі нямецкай Памераніі гарадамі РАЦ і БЕРНШТЭЙН, а таксама з баямі занялі больш 100 населеных пунктаў. За 7 студзеня нашы войскі ў гэтым раёне ўзялі ў палон больш 1.800 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Паўднёва ўсходней Брэслаўля працягваючы бai па расшырэнню плацдарма на заходнім беразе Одэра, у ходзе якіх нашы войскі авалодалі некалькімі населенымі пунктамі.

Паўднёва заходней Кракава нашы войскі, дзенічаючы ў цяжкіх умовах горна-лясістай мясцовасці, з баямі занялі больш 40 населеных пунктаў.

У Будапешце нашы войскі працягвалі баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка ў заходняй частцы Буда і занялі некалькі кварталаў. У баях за 7 лютага ў гэтым раёне ўзята ў палон больш 3.500 салдат і афіцэраў праціўніка.

За 7 лютага нашы войскі, на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 146 нямецкіх танкаў.

У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 30 самалётаў праціўніка.

## Рост комсамольскай арганізацыі

Сярод дапрызыўнікаў ваенкамата праводзяцца гутаркі аб міжнародным становішчы, аб поспехах Чырвонай Арміі ў яе адзінаборстве з гітлераўскімі полчышчамі.

У выніку гэтага ў апошні час адбываецца масавае ўступленне ў рады комсамола дапрызыўнікаў Чырвонай Арміі.

Жадаючы стаць членам ленінскага комсамола дапрызыўнікі Зайцаў Васіль і Чэшко В., першымі падалі заявы, дзе яны пісалі аб сваёй прыданасці Радзіме і што з часцю будуць выконваць устаў ленінскага комсамола. Комсамольская арганізацыя пры Райсовеце асовіяхіма задаволіла іх просьбу і прыняла у члены ленінскага комсамола.

Прыкладу дапрызыўнікаў Зайцава і Чэшко следуюць многія іх таварышы.

Казіцкі.

## На дапамогу фронту

Працоўныя Баранавіцкай области аказваюць усямерную дапамогу Чырвонай Арміі ў яе паходзе на Берлін.

Насельніцтва Любчанскага раёна ўжо сабрала 446.775 руб. на пабудову танкавай калоны «Комсамолец Беларусі».

У Ляхавіцкім раёне таксама разгарнуўся актыўны збор сродкаў. Па Ляхавіцкай дзяржплемканюшні сабрана 3500 руб. У вёсцы Шавілі—3.000 руб.

Усё-ж не ўсе сельсоветы актыўна прыняліся за гэту справу. Такія сельсоветы, як Дараўскі (старшыня сельсовета тав. Ціханюк, комсамолец Коўчур), Ліпскі, Альхоўскі і Крывошынскі сельсоветы, яшчэ не разгарнулі па сапраўднаму гэтай кампаніі, у выніку чаго яны з'яўляюцца адстаючымі ў раёне.

Задача ўсіх нашых мясцовых работнікаў, старшынь сельсоветаў, настаўнікаў, загадчыкаў хата-чытальнь, аб важнасці праходзячай кампаніі збора сродкаў на танкавую калону „Комсамолец Беларусі“ давесці да шырокіх мас.

Патрыятычны доўг насельніцтва падтрымаць пачын збору і сваімі зберажэннямі дапамагчы Чырвонай Арміі праследаваць па пятам раненага фашысцкага звера.

А. Ерашаў.

## Беражэцеся пажараў

Чырвоная Армія вызваліла наш раён, дзе на працягу трох год „гаспадарылі“ гітлераўскія людаеды. Яны спалілі многа сёл і гарадоў. Гітлераўскія акупанты назаўсёды выгнаны і ніколі ім ужо не вярнуцца на нашу зямлю. Цяпер мы вольна можам жыць і адбудоўваць свае вёскі.

Аднак, у нас яшчэ часта бываюць такія выпадкі, калі не па асцярожнасці жыхароў, якія няўмела карыстаюцца з агнём, узнікаюць пажары і знішчаюць усё на сваім шляху. Так у вёсцы Крывошын згарэў дом толькі з-за таго, што домахазяйка вытапіўшы печ, наклала ў печ дроў, закрыўшы трубу. Дровы загараліся і распачаўся пажар, які знішчыў дом.

Таму кожны грамадзянін павінен сцерагчыся пажараў і выконваць правілы супроцьпажарных мерапрыемстваў. Ніколі не патрэбна астаўляць без нагляду топячыяся печы і газоўкі, сур'ёзна сачыць за ісправаўнасцю пячэй і дымаходаў, не дапускаць дзецкіх гульняў з агнём.

Толькі асцярожнасць і акуратнасць можа пазбавіць нас ад тых выпадковых пажараў, якія зачастую ўзнікаюць у нас і прыносяць вялікія беды жыхарам.

Кульпаў.

## У Беларусь прыбывае маёмасць вывезеная нямецкімі акупантамі

У рэспубліку пачала паступаць маёмасць, у свой час вывезеная гітлераўскімі бандамі з прамысловых прадпрыемстваў і культурных устаноў Беларусі. З Рыгі дастаўлена каля 100 тысяч тамоў кніг, якія належаць бібліятэкам Акадэміі навук, імені Леніна, ЦК КП(б)Б Прывезена таксама 740 экспанатаў Віцебскага краязнаўчага музея. Знаходзяцца ў дарозе некалькі вагонаў з апаратурай кіностудыі „Савецкая Беларусь“. У Рыге таксама знойдзена абсталяванне Аршанскага ільнокамбіната, якое немцы не паспелі вывезці.

(БЕЛТА).

## Становішча ў Берліне

СТАКГОЛЬМ, 6 лютага (ТАСС). Шведская газета „Афтонбладэт“ паведамляе, што яшчэ вечарам 4 лютага ў Берліне прадаўжаліся пажары. Сотні тысяч людзей уцякаюць з палаючай сталіцы. Большасць адпраўляецца на захад і паўднёвы захад пехатой. Бежанцаў так многа, што на дарогах часта ўтвараюцца пробкі. Сільныя буйныя пажары адбываюцца ў раёнах ратушы, Цыргартэна, Унтэр дэн Ліндэн, Александэрплац“.

Газета „Экспрэсен“ змяшчае гутарку з адным шведам, які толькі што прыбыў з Берліна. „Уся ўлада ў Берліне,— сказаў ён,—у руках гестапа і эсэсаўцаў. Салдат рэгулярных войск на вуліцах Берліна амаль не відаць. Раздражэнне і сумятня ў Берліне не апісуемы. Людзі безрэзультатна чакаюць указаннаў ад улад. У арганізацыях, якія займаюцца ўпарадкаваннем бежанцаў і бяздомных, сапраўдны хаос“.

### ВЫКАНАЛІ ПЛАН ЛЕСАВЫВАЗАК

Сяляне Ліпскага і Федзюкоўскага сельсоветаў датэрмінова выканалі план лесавывазак 1-га квартала.

В. а. адказнага рэдактара В. БУРЛО.

ТС 20257 Адрас рэдакцыі: гор. Ляхавічы, вул. Пажарная, 8